**УДК 940.5(476)**

# АДУКАЦЫЙНАЯ ПАЛІТЫКА ПОЛЬСКІХ УЛАД НА БЕЛАРУСКАЙ ТЭРЫТОРЫІ ГРАМАДЗЯНСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ УСХОДНІХ ЗЯМЕЛЬ (люты 1919 – верасень 1920 г. )

***А.Г. ТРУБЧЫК***
***(Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт, Мінск)***

*Разглядаецца адукацыйная палітыаі польскай улады на акупаванай беларускай тэрыторы. Дэкларавaная магчымасць выбару мовы дэманстравала імкненне адміністрацыі дзейнічаць у духу федэралізма. Паказана, што да канца кастрычніка 1919 г. Польская дзяржава не фінансавала развіццё школьнай адукацыі, што паслабляла становішча аддзела адукацыі. Гэта давала магчымасць асобным школьным інспектарам дзейнічаць згодна са сваімі палітычнымі поглядамі. У сферы адукацыі адбывалася барацьба паміж чыноўнікамі, якія падтрымлівалі ідэю федэрацыі, і прыхільнікамі інкарпарацыі беларускіх зямель у склад Польскай дзяржавы. Хуткі рост польскіх школ назіраўся ў асноўным у Віленскай і Брэсцкай акругах. Сцвярджаецца, што матэрыяльную падтрымку польскім школам аказвалі грамадскія арганізацыі, падрыхтоўка настаўнікаў для беларускіх зямель ажыццяўлялася ў семінарыях Польшчы. Беларуская адукацыя атрымала развіццё толькі ў Мінскай акрузе.*

***Ключавыя словы:*** *школьная адукацыя, адукацыйная палітыка, Грамадзянскае ўпраўленне Усходніх зямель, секцыя асветы і грамадскай апекі, школьны інспектар.*

**Уводзіны.** Палітыка Польскай дзяржавы на занятых беларускіх землях у 1919–1920 гг. з’яўляецца адным са складаных пытанняў сучаснай гістарыяграфіі. Звязана гэта перш за ўсё з тым, што паміж польскімі і беларускімі гісторыкамі не знойдзена адзінага навуковага абгрунтавання тагачасных палітычных канцэпцый. У гэтым сэнсе няма паразумення і сярод прадстаўнікоў польскай гістарычнай навукі. Федэралізм ці інкарпарацыю прапаноўвала польская ўлада на беларускіх землях, якія знаходзіліся на шляху станаўлення нацыянальнай дзяржаўнасці?

Напярэдадні аднаўлення незалежнасці Польскай дзяржавы польскія палітычныя партыі і групоўкі займалі адрозныя пазіцыі ў адносінах да беларускага пытання. Праблема ўсходняй мяжы паўстала арэнай палітычных дыскусій сярод польскай дэлегацыі на Парыжскай мірнай канферэнцыі. Суперніцтва паміж федэратыўнымі і інкарпарацыйнымі планамі выявілася ў пастановах польскага Заканадаўчага сейма, адлюстравалася ў грамадскім меркаванні і на старонках тагачаснай прэсы.

У апошняе дзесяцігоддзе сярод польскіх гісторыкаў назіраецца схільнасць да ідэалізацыі федэралiскай канцэпцыі. Сучасная даследчыца, доктар гістарычных навук Ю. Гіроўска-Каллаўр лічыць, што Ю. Пілсудскі з’яўляўся перакананым федэралістам і ў дадзеным кірунку імкнуўся праводзіць палітыку на тэрыторыі Грамадзянскага ўпраўленя Усходніх зямель. Адказнасць за пераарыентацыю польскага ўрада ў бок інкарпарацыі ўскладаецца на мясцовую адміністрацыю і беларускіх нацыянальных дзеячоў [1].

**Асноўная частка.** На наш погляд, ў апошняй чвэрці мінулага стагоддзя польская гістарыяграфія прапаноўвала больш аб’ектыўны падыход да вывучэння беларускага пытання. Вядомая даследчыца К. Гамулка прааналізавала палітычныя ідэі, канцэпцыі і праекты польскіх арганізацый і суаднесла іх з рэальнай практыкай дзяржаўнага будаўніцтва [2]. Афіцыйную палітычную лінію, якую праводзіў кіраўнік дзяржавы, нельга назваць дакладна акрэсленай. У справе яго палітычных планаў і канцэпцый заўважаецца далёка ідучая скрытнасць. Напярэдадні ваеннага наступлення на Вільна Ю. Пілсудскі не вызначаў сябе ні федэралістам, ні прыхільнікам інкарпарацыі. Палітыка адносна лёсу літоўска-беларускіх зямель павінна была акрэсліцца ў выніку заняцця Вільні. Ю. Пілсудскі прыняў рашэнне, “якое не закрывала шляхоў да ўсіх магчымых варыянтаў” [3, с. 63]. Гэтым рашэннем была адозва “Да жыхароў былога Вялікага Княства Літоўскага” ад 22 красавіка 1919 г. Сама назва магла ўспрымацца як пачатак федэратыўнай палітыкі. Галоўнакамандуючы абяцаў насельніцтву “даць магчымасць вырашаць унутраныя нацыянальныя і рэлігійныя справы так, як самі захочаце, без якога-небудзь гвалту або націску з боку Польшчы” [4, с. 1–2].

Віленская адозва, у якой ніводнага канкрэтнага слова не гаварылася аб будучым дзяржаўным ладзе беларускіх зямель, павінна была вызначацца як платформа афіцыйнай польскай палітыкі. Першым крокам па яе рэалізацыі стала перадача ўлады на занятых польскімі войскамі тэрыторыях грамадзянскай адміністрацыі. Ю. Пілсудскі выдаў дэкрэт ад 13 мая 1919 г., які тычыўся арганізацыі Грамадзянскага ўпраўлення Усходніх зямель (ГУУЗ). Генеральны камісарыят станавіўся цэнтральнай уладай і непасрэдна падпарадкоўваўся Галоўнакамандуючаму.

Сярод прыярытэтных накірункаў палітыкі польскіх улад на тэрыторыі ГУУЗ асобнае месца займала адукацыйная сфера. Арганізацыя школьнай справы згодна з воляй мясцовых жыхароў, магчымасць

выбару мовы выкладання маглі прадвызначыць вынікі плебісцыту на гэтых землях. Відавочна, што школьная адукацыя стала полем палітычнай барацьбы паміж прыхільнікамі праграмы, абвешчанай ў Віленскай адозве, і рэалізатарамі ідэі інкарпарацыі.

Аб гэтым выразна сведчыць форма і змест крыніц, якія захаваліся. Перш за ўсё, гэта справаздачы і ліквідацыйныя рапарты павятовых і акруговых школьных інспектараў, а таксама карэспандэнцыя інструктараў Таварыства стражы крэсовай (ТСК – польская грамадская арганізацыя, створаная ў Польшчы ў 1918 г. нацыянал-дэмакратычнымі коламі. У сакавіку 1919 г. яна пачала распаўсюджваць сваю дзейнасць на беларускія землі, захопленыя польскімі войскамі. Займалася арганізацыяй органаў мясцовага самакіравання і падрыхтоўкай плебісцыту, на якім насельніцтва павінна было выказацца за далучэнне тэрыторыі ГУУЗ да Польшчы.). Гэтыя дакументы дазваляюць выявіць асаблівасці і ўмовы развіцця школьнай справы ў розных рэгіёнах ГУУЗ. Усе распараджэнні цэнтральных органаў улады на занятых польскімі войскамі беларускіх землях распаўсюджваліся пры дапамозе “Службовага дзённіка Грамадзянскага ўпраўлення Усходніх зямель”, які пачаў выдавацца з красавіка 1919 г. у Варшаве, а затым у Вільні. Да мая 1920 г. было надрукавана каля 20 распараджэнняў і цыркуляраў, якія тычыліся асветы і школьніцтва. Усе гэтыя дакументы былі падпісаны намеснікам Генеральнага камісара Е. Івашкевічам. Сам Ю. Асмалоўскі амаль не кранаўся школьнай справы, тым самым здымаючы з сябе ўсю адказнасць за яе ажыццяўленне.

Аналіз афіцыйнай заканадаўчай базы, матэрыялаў справаводства польскіх органаў адукацыйнай улады, статыстычных даных школьніцтва, дакументаў аб асветніцкай і дабрачыннай дзейнасці польскіх грамадскіх арганізацый і іншых крыніц дазволіў вылучыць два храналагічныя перыяды адукацыйнай палітыкі польскіх улад на тэрыторыі ГУУЗ.

*Перыяд з красавіка па канец кастрычніка 1919 г.* быў звязаны з дзейнасцю першага начальніка аддзела асветы і культуры пры Генеральным камісарыяце Уладзіслава Ліхтаровіча. Да пачатку новага навучальнага года адбыліся назначэнні мясцовых настаўнікаў, перавага надавалася падтрымцы агульнаадукацыйных школ, якія дазвалялася ўтвараць згодна з воляй мясцовага насельніцтва.

У першым распараджэнні, якое тычылася арганізацыі асветы і школьніцтва на тэрыторыі ГУУЗ, абвяшчалася ўсталяванне прынцыпаў свабоды навучання на роднай мове ўсіх нацыянальных груп. Ажыццяўленне гэтых прынцыпаў павінна было забяспечыць магчымасць арганізацыі нацыянальных школ [5, а. 330].

Дазвол вольнага выбару нацыянальнага характару школы дэманстраваў намер польскіх улад дзейнічаць згодна з пастулатамі Віленскай адозвы. Разам з тым аналіз патрэбы ў стварэнні нацыянальных школ быў вельмі важны для выбару далейшай польскай палітыкі. Выглядаў ён не на карысць беларускамоўноўнай адукацыі, бо мясцовае насельніцтва ў большасці аддавала перавагу рускім школам. Прыхільнікі інкарпарацыі лічылі, што стварэнне значнай колькасці рускіх школ ва ўмовах вайны з Савецкай дзяржавай пагражала палітычнай стабільнасці польскай ўлады на занятых землях. Некаторыя школьныя інспектары пачалі схіляць насельніцтва да стварэння польскіх школ. Пры гэтым не дапускалася арганізацыя беларускіх, якія атаясамляліся з рускімі.

Аддзел асветы кіраваў дзейнасцю павятовых адукацыйных органаў праз акруговых школьных інспектараў (у чэрвені-ліпені 1919 г. адбылося афіцыйнае афармленне акруговых і павятовых ўлад на тэрыторыі ГУУЗ. У склад ведамства кожнай акругі быў назначаны школьны інспектар, які праз акругова камісара падпарадкоўваўся кіраўніцтву САіГА Генеральнага камісарыята. У 1919–1920 гг. школьным інспектарам Віленскай акругі быў Вітольд Венцслаўскі, Мінскай акругі – Люцыян Квек, Брэсцкай акругі – Казімір Вольбецк.). У сваю чаргу акруговыя ўлады не маглі належным чынам кантраляваць усе павятовыя школьныя інспектараты, што было звязана з раскіданасцю населеных пунктаў на вялікія адлегласці і адсутнасцю транспартных сродкаў. Тым самым на тэрыторыі ГУУЗ стваралася ўмовы для правядзення адукацыйнай палітыкі ў залежнасці ад асабістых палітычных поглядаў асобных мясцовых адміністратараў.

Павятовыяі акруговыя кіраўнікі асветай, якія жадалі стварыць як мага больш польскіх школ да пачатку новага навучальнага года, абапіраліся на фінансавую падтрымку з боку польскіх грамадскіх арганізацый. ТСК, Галоўная апякунская рада (ГАР)[1], Таварыства імя Ю. Пілсудскага[2], Польскае школьнае таварыства (ПШТ)[3] і іншыя пачалі дзейнічаць на беларускай тэрыторыі, занятай польскімі войскамі, з

[1]Галоўная апякунская рада (пол. – Rada Glówna Opiekuncza) – польская грамадская дабрачынная арганізацыя, створаная ў 1918 г. у Польшчы. На тэрыторыі ГУУЗ з красавіка праводзіла дабрачынныя акцыі, накіраваныя на матэрыяльную падтрымку мясцовага насельніцтва, сельскагаспадарчых кааператываў, польскіх культурна-асветных устаноў.

[2]Таварыства імя Ю. Пілсудскага – грамадская арганізацыя, дзейнасць якой была накіравана на нацыянальна-культурнае развіццё Польскай дзяржавы. Займалася распаўсюджаннем польскіх навучальных устаноў, падрыхтоўкай да будучага плебісцыту па пытанні аб далучэнні беларускіх зямель да Польшчы.

[3]Польскае школьнае таварыства (пол. – PolskaMacierż Skolna) – польская культурна-асветная каталіцкая арганізацыя ў 1905–1939 гг. На тэрыторыі ГУУЗ займалася арганізацыяй польскіх школ, выдавала польскамоўныя падручнікі і кнігі, праводзіла дабрачынныя акцыі.

красавіка 1919 г. Фінансаванне дадзеных арганізацый ішло ў асноўным з Варшавы, што давала ім магчымасць дзейнічаць незалежна ад Генеральнага камісарыята.

Да канца кастрычніка 1919 г. Польская дзяржава амаль не вылучала грошай на развіццё школьнай справы на тэрыторыі ГУУЗ. Нават калі дапусціць, што ў гэты час аддзел асветы імкнуўся будаваць адукацыйную сістэму згодна з федэралісткай ідэяй, ва ўмовах адсутнасці ўласных сродкаў кіраўнік аддзела асветы не меў магчымасці рэалізоўваць запланаваныя мерапрыемствы. Так, у ліпені 1919 г. У. Ліхтаровіч пачаў назначэнні настаўнікаў, якіх, на яго думку, было дастаткова для тых школ, якія ўжо існавалі. Для падрыхтоўкі настаўніцтва для новых школ планавалася пачаць арганізацыю сеткі настаўніцкіх семінарый.

У гэты ж час, дзякуючы намаганням польскіх грамадскіх арганізацый, у паразуменні з большай часткай павятовых школьных інспектараў Гродзеншчыны, Віленшчыны і Брэстчыны, пачалася актыўная праца па адбудове школ і правядзенні польскіх настаўніцкіх курсаў [6, с. 26]. Летам 1919 г. адбыліся 2 3-месячныя педагагічныя курсы ў Беластоку, Гродна, Ваўкавыску, на якіх было падрыхтавана 600 настаўнікаў для польскіх школ Гродзеншчыны [7, к. 1–4]. Настаўніцкія курсы, арганізаваныя ў Брэсцкім, Кобрынскім, Пружанскім, Ваўкавыскім і Слонімскім паветах, да кастрычніка 1919 г. забяспечылі настаўнікамі 200 новых польскіх школ у Брэсцкай акрузе [8, а. 24].

На канферэнцыі прадстаўнікоў адукацыйных улад 31 ліпеня 1919 г. у Вільні Ю. Асмалоўскім заявіў: "Адносна рускіх школ мы не маем ніякіх абавязкаў і ніякіх субсідый не выдаём. Беларускім школам належыць даць субсідыі, калі аб'ектыўна знойдзецца пэўная колькасць жадаючых вучыцца пабеларуску. Хутчэй за ўсё, такіх выпадкаў будзе мімнімальна. Яўрэйскія школы ніякіх субсідый атрымліваць не будуць. Мы і так дазволілі насельніцтву ажыццяўляць такую апеку, што на большую дапамогу ад ураду яны разлічваць не павінны. У нас няма ніякага спецыяльнага грашовага фонду на развіццё школ, акрамя таго, застаецца неакрэсленай наша сувязь з Польшчай, таму крэдыт, які мы атрымалі, аддаём на польскія школы, а для астатніх будзем з'яўляцца толькі добразычлівымі наглядальнікамі [9, к. 93–95]. Польскае кіраўніцтва добра разумела, што без дзяржаўнай падтрымкі беларускія і рускія школы не будуць мець шансаў на развіццё. Мясцовае насельніцтва, абяздоленае ўмовамі ваеннага часу, не магло выдаткоўваць сродкі на ўтрыманне школ, таму вымушана было аддаваць дзяцей ў школы на польскай мове навучання.

Няпольскія школы атрымалі магчымасць развіцця толькі ў Мінскай акрузе. З часоў нямецкай акупацыі на Міншчыне засталася значная колькасць беларускіх школ, і з гэтым польская ўлада не магла не лічыцца, акрамя таго, асабліва з восені 1919 г. тут былі сканцэнтраваны асноўныя сілы беларускага нацыянальнага руху. На Міншчыне захавалася традыцыя мясцовага самакіравання, якая цягнулася яшчэ з былых расійскіх часоў, таму школы былі перададзены на ўтрыманне Мінскага магістрата, павятовых і гмінных рад і прыватных грамадскіх арганізацый. Па-сутнасці, адукацыйныя ўлады апынуліся па-за межамі сваіх непасрэдных абавязкаў. Не мелі ўплыву на Міншчыне і польскія грамадскія арганізацыі.

У сярэдзіне жніўня 1919 г. пры Мінскім магістраце быў арганізаваны аддзел асветы і грамадскай апекі, які ўзначаліў Чэслаў Радзевіч [10, а. 8]. У пачатку верасня магістрат згадзіўся прыняць на сваё поўнае ўтрыманне 35 пачатковых школ (былых савецкіх школ I ступені), 6 вышэйшых пачатковых школ, беларускую гімназію і гандлёвую школу, а таксама школу для глуханямых дзяцей. Пры аддзеле асветы магістрата была ўтворана камісія, якая павінна была вызначыць нацыянальную прыналежнасць гэтых школ, падабраць персанал, перапісаць інвентар, ацаніць неабходнасць рамонту і г.д. [11, а. 31]. У склад камісіі ўвайшлі прадстаўнікі ад грамадскіх асветных арганізацый – Беларускай школьнай рады Міншчыны (БШРМ – беларуская нацыянальная арганізацыя, утвораная 30 жніўня 1919 г. ў Мінску. Старшынёй з'яўляўся С. Рак-Міхалоўскі. У адносінах з польскімі ўладамі выступала апекуном беларускай школьнай справы), Польскай школьнай рады (ПШР – грамадская дабрачынная арганізацыя, утвораная ў 1919 г. шляхам злучэння ПШТ Міншчыны і аддзела народных школ Польскай рады Міншчыны), а таксама ад школьнага аддзела Яўрэйскай абшчыны. Дадзеныя арганізацыі з дазволу польскай улады заяўлялі сябе апекунамі адпаведных нацыянальных школ.

Ацаніць вынікі польскай адукацыйнай палітыкі, якая праводзілася да канца кастрычніка 1919 г. вельмі складана. За ўвесь перыяд дзейнасці аддзела асветы на чале з У. Ліхтаровічам (красавік – кастрычнік 1919 г.) не захавалася ніводнай яго справаздачы. Адсутнасць фінансавых сродкаў прадвызначыла слабасць першых органаў асветы пры Генеральным камісарыяце. Гэта дало магчымасць польскім грамадскім арганізацыям і мясцовым адміністратарам, якія мелі інкарпарацыйныя погляды, ажыццяўляць непасрэдную апеку над школьнай справай. У Віленскай і Брэсцкай акрузе пачалася паступовая рэарганізацыя рускіх і беларускіх школ у польскія. Беларуская школьная справа распаўсюджвалася толькі на Міншчыне.

*Другі перыяд польскай адукацыйнай палітыкі на тэрыторыі ГУУЗ (канец кастрычніка 1919 г. – 9 верасня 1920 г.)* пачаўся у выніку кадравых змен і рэарганізацыі аддзела ў секцыю асветы і грамадскай апекі (САіГА) на чале з Люцыянам Зажэцкім. Яму падпарадкоўваліся: агульны аддзел (начальнік – Вац-

лаў Езерскі), аддзел агульных школ (Уладзімір Галецкі), аддзел сярэдніх і прафесійных школ (Казімір Жэлянгоўскі). Пры секцыі працавалі школьныя рэвізоры, галоўнай задачай якіх з'яўлялася "ажыццяўленне непасрэднага кантролю за педагагічнай і грамадскай дзейнасцю школ усіх тыпаў" [12].

Новы кіраўнік аддзела асветы крытыкаваў свайго папярэдніка як "празмернага апекуна беларускіх школ". Л. Зажэцкі з'яўляўся вядомым ў Польшчы педагогам і грамадска-палітычным дзеячам: пераканаў эндэк па сваіх палітычных поглядах, займаў пасаду дырэктара ў Галоўным урадзе Польскага школьнага таварыства, узначальваў секцыю прафесійных школ пры Міністэрстве веравызнанняў і грамадскай асветы. Педагагічныя погляды Зажэцкага былі шчыльна звязаныя з палітычнымі, аб чым яскрава сведчаць яго апублікаваныя творы.

У 1920 г. была выдадзена "Агульная дыдактыка, альбо выхаванне характару праз навучанне", у якой былі зроблены прапановы па рэалізацыі адукацыйнай палітыкі, якая б спрыяла ўзмацненню нацыянальнага адзінства Польскай дзяржавы. Развіццё асветы на тэрыторыі ГУУЗ апынулася ў руках чалавека, які лічыў, што "дзяржава павінна арганізоўваць польскія школы нават для невялікай колькасці польскага насельніцтва, незалежна ад таго, якія школы ўжо існуюць у дадзенай мясцовасці; дзяржаве трэба клапаціцца аб падрыхтоўцы настаўнікаў, якім неабходна валодаць польскай мовай, ведаць польскую культуру і мець адпаведную нацыянальную свядомасць; дзяржаўныя сярэднія і вышэйшыя школы павінны быць толькі польскімі, а нацыянальныя меншасці могуць утрымліваць свае школы прыватна; абавязкова спыніць доступ да школ людзям з неадпаведнай, слабай агульнай і прафесійнай падрыхтоўкай; для усіх школ вызначыць агульны кірунак выхавання і праграмы" [13, с. 132].

У канцы кастрычніка – лістападзе 1919 г. з грамадзянскай адміністрацыі на ўсіх узроўнях (Генеральнага камісарыята, акруговых камісарыятаў, павятовых старастваў) пачалі выдаляцца прадстаўнікі мясцовага паходжання, якія мелі федэралістычныя погляды на будучае дзяржаўнае ўладкаванне краю [14, с. 263].

Згодна з адукацыйнай сістэмай, якая фарміравалася на тэрыторыі Польскай дзяржавы, замест усіх ранейшых тыпаў навучальных устаноў на занятых беларускіх землях павінны былі ўтварыцца агульнаадукацыйныя, сярэднія і прафесійныя, а таксама вышэйшыя школы. Ва ўсіх школах абвяшчалася ўвядзенне польскай мовы ў якасці абавязковага вучэбнага прадмета, на які адводзілася не менш за 2 гадзіны на тыдзень у кожным класе. У няпольскія школы назначаліся настаўнікі польскай мовы, працу якіх павінны былі аплачваць са сродкаў павятовых школьных інспекаратаў. Прыватным школам даз-валялася распрацоўваць уласныя вучэбныя праграмы і свабодна імі карыстацца. Аднак тыя школы, якія атрымлівалі дзяржаўную дапамогу, павінны былі працаваць згодна з праграмамі, распрацаванымі ў САіГА [15].

У студзені 1920 г. Л. Зажэцкі выдаў распараджэнне аб увядзенні ў школах адзіных вучэбных праграм, аднак "прыстасаванне гэтых праграм да патрэб школы на ўсходніх землях" было адкладзена на нявызначаны час [16, к. 60]. Навучанне ў дзяржаўных школах працягвалася па тых планах, якія складаліся настаўнікамі і зацвярджаліся мясцовымі школьнымі інспектарамі.

Арганізацыя новых школ на беларускай тэрыторыі ГУУЗ дазвалялася прыватным асобам, правамоцным грамадскім таварыствам і ўрадавым арганізацыям. Дзейнасць прыватных школ да пачатку 1920 г. амаль не рэгулявалася з боку САіГА. У студзені 1920 г. выйшла пастанова, па якой прыватныя арганізацыі і таварыствы павінны былі адчыняць школы толькі згодна з агульнымі правіламі, якія дзейнічалі на тэрыторыі ГУУЗ. Калі прыватнае таварыства згаджаецца на атрыманне дзяржаўнай дапамогі для школы, яно пазбаўляецца права ажыццяўлення кантролю за вучэбным працэсам, выдачы асабістых цыркуляраў і распараджэнняў у справах асветы, назначэння настаўнікаў [17].

З кастрычніка 1919 г. пачалося сістэматычнае фінансаванне з бюджэту ГУУЗ курсаў і семінарый па падрыхтоўцы настаўнікаў для ўсходніх зямель, арганізаваных на тэрыторыі Польшчы. Аднак аказалася мала ахвотнікаў ехаць працаваць на шматнацыянальныя, спустошаныя вайной землі. Кіраўніцтва САіГА разумела, што прыцягнуць лепшыя настаўніцкія сілы немагчыма без павышэння зарплаты. На тэрыторыі ГУУЗ яна складала 300 – 500 марак у месяц (ў 2 – 3 разы ніжэйшая, чым у Польшчы). Па дамоўленасці з Генеральным камісарам у снежні 1919 г. зарплаты былі павялічаны да 700 – 900 марак, а з сакавіка 1920 г. сярэдняя зарплата дасягала 1000 марак у залежнасці ад кваліфікацыі і педагагічнага стажу [18].

Акрамя таго, настаўнікам былі назначаны дадатковыя выплаты і льготы на ўзроўні дзяржаўных чыноўнікаў. У сакавіку 1920 г. на тэрыторыі ГУУЗ уводзіўся "надзвычайны дадатак" (дадатковыя грашовыя выплаты, якія былі ўведзены для чыноўнікаў ГУУЗ на перыяд ваеннага часу) для спецыялістаў (60–100 % ад зарплаты), дакладна вызначалася плата некваліфікаваным настаўнікам (не менш за 1000 – 1200 марак у месяц), назначалася дадатковае ўзнагароджанне кіраўнікам школ. На органы мясцовага самакіравання ўскладалася не толькі забеспячэнне настаўнікаў жыллём, святлом і апалам, а таксама прадугледжвалася харчовая дапамога ў дакладна вызначаных памерах: 25 пудоў жыта, 30 пудоў бульбы, 4 пуды гародніны і 1 пуд тлушчу [19].

У снежні 1919 г. Л. Зажэцкі загадаў акруговым школьным інспектарам пачаць арганізацыю настаўніцкіх семінарый. Дзяржаўным семінарыям дазвалялася працаваць толькі на польскай мове. На

тэрыторыі ГУУЗ маглі ўтварацца семінарыі з іншымі мовамі навучання, аднак у гэтым выпадку дзяржаўныя субсідыі не вылучаліся. У сакавіку 1920 г. у Брэсцкай акрузе дзейнічалі 2 польскія настаўніцкія семінарыі, у Віленскай акрузе – 4. У Мінскай акрузе падрыхтоўка польскіх настаўнікаў не праводзілася [20].

З канца снежня 1919 г. секцыя асветы пачала арганізацыю і паступовы перавод на дзяржаўнае ўтрыманне польскіх сярэдніх школ [21, к. 11]. Згодна з "Часовымі правіламі для часткова адзяржаўленых сярэдніх школ на тэрыторыі Усходніх зямель", прынятымі 30 студзеня 1920 г., гэтыя школы перадаваліся на ўтрыманне ГУУЗ без права на ўласнасць, якая заставалася ў адпаведных грамадскіх арганізацый, таварыстваў і прыватных асобаў [22, к. 20–23]. Польская ўлада імкнулася як мага хутчэй ліквідаваць прыватныя сярэднія школы, пакінуўшы іх без дзяржаўнай дапамогі. Настаўнікі прыватных школ не мелі права на ільготы і дадаткі. Гэта прыводзіла да таго, што настаўнікі пачалі пераходзіць у дзяржаўныя школы.

Згодна з ацэнкай Л. Зажэцкага, з кастрычніка 1919 г. па чэрвень 1920 г. колькасць школ на ўсходніх землях павялічылася на 120 % [23, к. 60], аднак дадзеная лічба была значна перабольшана. Папершае, да студзеня 1920 г. СаіГА не мела адзінай статыстыкі аб колькасці школ на тэрыторыі Віленскай, Мінскай і Брэсцкай акруг. Па-другое, калі параўнаць афіцыйныя даныя за студзень – чэрвень 1920 г. (у снежні 1919 г. на тэрыторыі ГУУЗ было 2688 агульнаадукацыйных школ, 163 565 дзяцей і 3670 настаўнікаў. У чэрвені 1920 г. было 2508 агульнаадукацыйных школ, 162 117 дзяцей і 3570 настаўнікаў), то атрымаецца, што за гэты перыяд агульная колькасць школ павялічылася не больш чым на 3 %. Хутчэй за ўсё, кіраўнік секцыі асветы меў на ўвазе развіццё польскіх школ на тэрыторыі ГУУЗ, якое адбывалася шляхам рэарганізацыі школ іншых нацыянальнасцей.

Рост колькасці польскіх школ на Міншчыне пачаўся з сакавіка 1920 г., пасля таго як акруговы школьны інспектар Мечыслаў Каўс падаў у адстаўку. Новы інспектар Люцыян Квек накіраваў да САіГА сакрэтны ліст, у якім выказаў незадавальненне арганізацыяй школьнай справы на Міншчыне і выказаў шэраг уласных прапаноў. Л. Квек зыходзіў з таго, што школьная справа на Міншчыне павінна служыць асноўным палітычным мэтам Польскай дзяржавы – далучэнню гэтых зямель да Польшчы. На яго думку, неабходна было прыняць усе школы на дзяржаўнае ўтрыманне: польскія – каб забяспечыць іх развіццё, а астатнія – каб улады цалкам маглі іх кантраляваць. Асаблівую пагрозу бачыў акруговы інспектар з боку беларускіх школ, якія да гэтага часу набылі значнае развіццё за кошт скарачэння колькасці рускіх. Падтрымка рускіх школ магла б знізіць незадаволенасць з боку рускіх настаўнікаў, якія засталіся без сродкаў да існавання, і адцягнуць увагу насельніцтва ад беларускага нацыянальнага руху. Беларускія і рускія школы неабходна паступова пераўтвараць у польскія са згоды мясцовага насельніцтва. Для ўзмацнення польскіх школ на Міншчыне неабходна "сілай прыцягнуць сюды настаўнікаў з Польшчы" [24, к. 23–26].

Палітыка, накіраваная на падтрымку развіцця польскай школьнай справы ў Мінскай акрузе, была спынена ў сувязі з ваеннай эвакуацыяй (ліпень 1920 г.). У ліквідацыйным рапарце школьнага інспектара было адзначана 1120 агульнаадукацыйных школ (327 польскіх, 233 беларускіх, 537 рускіх, 23 яўрэйскіх), 77 сярэдніх школ (16 польскіх, 2 беларускія, 51 руская і 31 яўрэйская) і 15 прафесійных навучальных устаноў (3 польскія і 12 рускіх) [25, к. 8–11].

**Заключэнне.** На тэрыторыі ГУУЗ, дзе афіцыйна дазвалялася арганізацыя розных нацыянальных школ згодна з жаданнем мясцовага насельніцтва, фінансавую падтрымку з боку дзяржавы атрымалі пераважна польскія школы. Матэрыяльная дапамога польскім школам, якую таксама аказвалі грамадскія арганізацыі, значна паўплывала на зніжэнне папулярнасці сярод насельніцтва школ з іншымі мовамі навучання. Найбольш моцны ўздым польскага школьніцтва адбыўся з кастрычніка – студзеня 1919 г. на тэрыторыі Брэстчыны, Віленшчыны і Гродзеншчыны. Асноўнымі накірункамі дзейнасці польскіх адукацыйных органаў улады на тэрыторыі ГУУЗ было развіццё сеткі сярэдніх і прафесійных школ, паступовы перавод усіх навучальных устаноў пад кантроль дзяржавы, намаганні распрацаваць адзіныя навучальныя праграмы. Павелічэнне колькасці школ з польскай мовай навучання адбывалася за кошт рэарганізацыі рускіх, яўрэйскіх і беларускіх нацыянальных школ. Кіраўніцтва секцыі асветы прыцягвала на тэрыторыю ГУУЗ настаўнікаў, падрыхтаваных у семінарыях Польшчы, каб забяспечыць польскія школы настаўнікамі. У адносінах да беларускай адукацыі палітыка польскіх улад зыходзіла з неабходнасці падтрымаць развіццё беларускіх школ толькі на Міншчыне. Аднак у сакавіку 1920 г., пасля правядзення беларуска-польскіх перамоў, у Мінскай акрузе быў назначаны новы школьны інспектар, дзейнасць якога была накіравана на паступовую ліквідацыю ўсіх дасягненняў беларускай школьнай справы.

У сувязі з паспешнай эвакуацыяй у ліпені 1920 г. адбылася ліквідацыяй ГУУЗ. 9 верасня 1920 г. зноў занятыя беларускія паветы перайшлі ў падпарадкаванне да Упраўлення прыфрантавымі і этапавымі тэрыторыямі на чале з У. Рачкевічам. Справы адукацыі перадаваліся дэпартаменту асветы, які падпарадкоўваўся Міністэрству веравызнанняў і грамадскай асветы Польшчы.

ЛІТАРАТУРА

1. Gierowska-Kałłaur, J. Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich (19 lutego – 9 września 1920) / J. Gierowska-Kałłaur. – Warszawa : Wydawnictwo Neriton Institut Historii PAN, 2003. – 447 s.

2. Gomółka, K. Polskie ugrupowania polityczne wobec kwestii białoruskiej, 1918–1922 / K. Gomółka . – Warszawa, 1989. – 260 s.; Gomółka, K. Białorusini w II Rżeczypospolitej / K. Gomółka. – Gdańsk : Wyd. Politechniki Gdańskiej, 1992. – 178 s.
3. Gomółka, K. Polskie ugrupowania polityczne wobec kwestii białoruskiej, 1918–1922 / K. Gomółka . – Warszawa, 1989. – 260 s.
4. Да насяленьня Вялікага Княства Беларуска-Літоўскага // Звон. – 1919. – 25 жн. – С. 1–2.
5. Rosporządzenie tymczasowe Komisarża Generalnego Ziem Wshodnich, dotyczące szkolnictwa i oświaty, 11 pazdż. 1919 r. // Dziennik Urżędowy ZCZW. – 1919. – № 31 (18 listop.). – Poz. 340.
6. Gierowska-Kałłaur, J. Straż Kresowa a Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich. Współdziałanie czy rywalizacja?/ J. Gierowska-Kałłaur – Warszawa : Instytut Histirii PAN, 1999. – 130 s.
7. Sprawozdanie rzeczowe Inspektoratu Szkolnego Okręgu Brzeskiego za czas swego istnienia od 3.04.1919 r. do 29.09.1920 r. // Biblioteka Publiczna m. st. Warszawy. Dział Starych Drukow i Rękopisow. Zarząd Cywilny Ziem Wshodnich. – Akc. 1773/10/IV.
8. Sprawozdanie Inspektorza Szkólnego powiatu Bržeskiego, luty 1920 r. // Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. – Ф. 2. Воп. 1. Спр. 16.
9. Protokół konferencji z 31 lipca 1919 w Wilnie // BPW. DSDiR. ZCZW. – Akc. 1671.
10. Дело с протаколами заседаний Магистрата г. Минска, август 1919 г. – февраль 1920 гг.// Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці. – Ф. 1806. Воп. 1. Спр. 4 б.
11. Дело с протаколами заседаний Магистрата г. Минска, август 1919 г. – февраль 1920 гг. // Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці. – Ф. 1806. Воп. 1. Спр. 4 б.
12. Rosporządzenie tymczasowe Komisarża Generalnego Ziem Wshodnich, dotyczące szkolnictwa i oświaty, 11pazdż. 1919 r. // Dziennik Urżędowy ZCZW. – 1919. – № 31 (18 listop.). – Poz. 340.
13. Trębicka- Postrzygacz, B. Lucjan Zarzecki / Beata Trębicka- Postrzygacz // Polska myśl pedagogiczna po 1918 roku / pod. red. Ewy Brodawskiej-Adamowicz / Wyd.-wo Akademmii Podlaskiej. – Siedlce, 2009. – 197 s.
14. Трубчык, А.Г. Сістэма польскіх органаў кіравання ў галіне народнай асветы на тэрыторыі Беларусі ў 1919–1920 гг.: адміністрацыйна-прававы аспект / А.Г. Трубчык // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки : сб. научных статей : в 2 ч. / РИВШ ; под. ред. В.Ф. Беркова. – Минск, 2011. – Ч. 1. – Вып. 11(16). – С. 264–270.
15. Rosporządzenie tymczasowe Komisarża Generalnego Ziem Wshodnich, dotyczące szkolnictwa i oświaty, 11pazdż. 1919 r. // Dziennik Urżędowy ZCZW. – 1919. – № 31 (18 listop.). – Poz. 340.
16. Zarzecki, L. Rzut oka na całość dzialności Sekcji Oświecenia Publicznegow Wilnie, Toruń, 12 stycznia 1921 r. // BPW. DSDiR. ZCZW. – Akc.1773/ 6/ II.
17. Okólnik Szefa Sekcji Oświecenia Publicznego Komisarjatu Generalnego Zarządu Cywilnego Ziem Wschodnichdo Inspektorów szkolnych okręgowych w sprawie stosunku czynników urzędowych do prywatnych towarzystw oraz tworzennia opiek szkolnych, 23 stycznia 1920 r. // Dziennik Urzędowy ZCZW. – 1920. – № 7 (31 stycz.). – Poz. 119.
18. Rozporządzenie Komisara Generalnego Ziem Wschodnich w predmiocie uregulowania płac nauczycieli szkół powszechnich, 16 marca 1920 r. // Dziennik Urzędowy ZCZW. – 1920. – № 22 (16 marca). – Poz. 545.
19. Rozporządzenie Komisara Generalnego Ziem Wschodnich wpredmiocie uregulowania płac nauczycieli szkół powszechnich, 16 marca 1920 r. // Dziennik Urzędowy ZCZW. – 1920. – № 22 (16 marca). – Poz. 545.
20. Okólnik do częściowo upaństwowanych szkół średnich na terenie Ziem Wschodnich w sprawie organizacji roku naukowego, prowadzenia nauczania i pracy wychowawczej // BPW. DSDiR. ZCZW. – Akc. 1773/ 6/ II.
21. Okólnik Szefa Sekcji Oświecenia Publicznego Komisarjatu Generalnego Zarządu Cywilnego Ziem Wschodnichdo Inspektorów szkolnych okręgowych, 5 grudnia 1919 r. // Dziennik Urzędowy ZCZW. – 1919. – № 4 (11 grud.). – Poz. 479.
22. Regułamin tymczasowy dla częściowo upaństwowanych szkół średnich na terenie Ziem Wschodnich, 30 stycznia 1920 r. // BPW. DSDiR. ZCZW. – Akc. 1773/ 6 / II.
23. Zarzecki, L. Rzut oka na całość dzialności Sekcji Oświecenia Publicznegow Wilnie, Toruń, 12 stycznia 1921 r. // BPW. DSDiR. ZCZW. – Akc.1773/ 6/ II.
24. Poufnie do Sekcji Oswiecenia Publicznego ZCZW, 14 stycznia 1920 // BPW. DSDiR. ZCZW. – Akc. 1750.
25. Sprawozdanie Naczelnika Okręgu Mińskiego za cały czas istnienia od 8.08.1919 r. do10.07.1920r. // BPW. DSDiR. ZCZW. – Akc.1750.

*Пастуніў 3.11.15*

## EDUCATIONAL POLICY OF POLISH CIVIL ADMINISTRATION ON EASTERN TERRITORY (FEBRUARY 1919 – SEPTEMBER 1920)

***A. TRUBCHYK***

*The article is devoted to the study of the Polish authorities on the occupied Belarusian territory. Announced opportunity of language choice demonstrated the desire of federalisation. Until the end of October 1919 Poland hasn't financed school education, that worsened education depatment. It gave an opporunity to school supervisors to follow their political ideas. There was a struggle between officials who supported the federalisation idea and followers of incorporation of Belarusian territory into Poland. Fast school increase took place in Vilnya and Brest regions. Polish social organisations financed schools, there was teacher training for Belarusian land in Polish seminaries. Belarusian education got opportunity to development only in Minsk region.*

***Keywords:*** *school education, educational policy, Civil administarion of eastern territory, department of education and social care, school supervisior.*